ЯЗЫКОВАЯ КОНВЕРГЕНЦИЯ И ДИВЕРГЕНЦИЯ В ПРИГРАНИЧЬЕ. ПРОБЛЕМЫ БИЛИНГВИЗМА

ДА ПРАБЛЕМЫ ЧЫСЦІНІ МАЎЛЕННЯ Ў ДРУКАВАНЫХ СМІ

Ю.М. Бабіч
Віцебск, УА "ВДУ імя П.М. Машэрава"

Захаванне чысціні маўлення з'яўляецца адным з асноўных крытэрыяў вербальнай культуры асобы. "Ва ўмовах білінгвізму,– адзначае праф. Лепешаў, – узнікае нямала праблем, звязаных з культурай мовы, у першую чаргу праблема чысціні маўлення" [1, 125]. Гэта датычыць розных сфер функцыянавання мовы ў грамадстве. Але існуюць і розныя погляды на закранутае пытанне. "Адны аўтары наракаюць на тое, што мова часопісаў, газет, нават паэзіі псуецца пад націскам прастамоўя, запазычаных слоў, іншыя, насупраць, гавораць пра тое, што літаратурная мова ў некаторых выданнях прыкметна аддаляецца ад жывога маўлення, з-за чаго траціць сваю выразнасць", – заўважае Т.Тамашэвіч [2, 4]. Апошнім часам у беларускамоўных сродках масавай інфармацыі істотна павялічылася колькасць слоў, якія належаць да лексікі абмежаванага ўжытку, могуць быць трактаваныя як прастамоўныя, слэнгавыя або жаргонныя элементы. Гэта тэндэнцыя можа тлумачыцца, на наш погляд, імкненнем асобных аўтараў і рэдакцыйных калектываў у цэлым стаць бліжэй да карыстальнікаў, да чытачоў, максімальна папулярна і адначасова займальна данесці інфармацыю, што ў канчатковым выніку павінна паспрыяць і росту накладаў выданняў. Вызначаючы асноўны стылістычны прынцып публіцыстычнага тэксту, В.Кастамараў гаворыць пра эмацыйнае адзінства,"сувязь экспрэсіі і стандарту" [3, 23]. Такі, здавалася б, супярэчлівы падыход да выбару моўных сродкаў і сапраўды спрыяе павышэнню цікавасці да напісанага. А паколькі ў сучасных грамадска-палітычных умовах Беларусь знаходзіцца пераважна ў расійскамоўнай медыяпрасторы, то значная колькасць стылістычна маркіраваных, некадыфікаваных лексічных адзінак трапляе ў беларускамоўны дыскурс з рускай мовы. Заўважым, аднак, што і там названыя рэсурсы пераважна не з'яўляюцца агульнаўжывальнымі, а выступаюць стылістычна афарбаванымі і выконваюць адпаведную функцыю. Але гэта насамрэч прыцягвае ўвагу чытача, прымушае яго міжволі засяродзіцца на пэўным тэкставым фрагменце. Сярод такіх прадуктыўных публіцыстычных "наватвораў", што выяўлены намі ў беларускамоўных СМІ, пераважаюць дзеясловы (*адрывацца*, *абарзець*, *ламануцца*, *засвяціцца*, *завісаць*, *касіць*, *кінуць* і інш.) і назоўнікі (*бабло*, *барыга*, *кайф*, *фішка* і інш.), а таксама пэўныя ўстойлівыя спалучэнні (напрыклад, *па барабану*, дзе рэалізавана прыслоўнае значэнне "усё роўна, не важна, не цікава"). Праілюструем гэта прыкладамі з друкаваных выданняў: *Мужчына, так бы мовіць, па поўнай "**адрываўся**" ў начным клубе* ("Чырвоная змена", 23.02.11.); *Фіны так **абарзелі**, што ходзяць з кашалькамі ў задніх кішэнях джынсаў, з мабіламі, прычэпленымі да поясаў, з грашыма на віду ў кішэнях і не баяцца, што пралетарыі кішэннай цягі іх параскулачваюць…*("Віцебскі кур'ер", 30.09.10.); *Расіяне ўсё ж **ламануліся** па машыны ў Беларусь* ("Звязда", 24.09.10.); *Падазроныя выкралі больш за 126 тон цукру. А "**засвяціліся**" службовыя асобы аднаго з прыватных прадпрыемстваў…* ("Звязда", 1.02.11.); *У лістападзе маскоўскія гульцы "**завісалі**" ў мінскіх казіно на працягу амаль двух тыдняў* ("Звязда", 24.11.10.); *Мне ўжо потым сказалі, што гэта быў афганскі*

*разведчык… **“Касіў”** пад мірнага жыхара* (“Звязда”, 15.02.11.); *Махляр “**кінуў**” на аўто сем чалавек. У Шумілінскім раёне спрытны дзялок паабяцаў грамадзянам прыгнаць з Германіі аўто, узяў грошы і падмануў* (“Звязда”, 28.01.11.). *Кожны паліцыянт не прапускае магчымасці садраць з гора-бізнесмэна **бабла*** (“Наша ніва”, 12.01.11.); *Хутка знайшлі **барыгаў**, якія падахвоціліся дапамагчы нам за пэўную плату* (“Наша ніва”, 9.02.11.); *Валька таксама лавіла **кайф** – ёй падабалася ехаць, не трымаючыся, падняўшы рукі ўгору* (“Звязда”, 30.10.10.); *Яны працуюць для таго, каб спектакль атрымаўся… Гэта прыносіць сапраўдны **кайф*** (“Віцебскі праспект”, 11.11.10.); *Многім з пакупнікоў “**па барабану**”, што там намалявана і напісана на пакеце – абы мука* (“Звязда”, 3.02.11.); *Яму асабіста “**па барабану**”, дзе, на якім месцы стаіць мова…* (“Звязда”, 19.02.11.).

Асабліва часта апошнім часам стала ўжывацца лексема *фішка*. ТСБМ дае наступную агульнапрынятую дэфініцыю:”Кубік, квадрацік, кружок, які служыць у некаторых настольных гульнях для падліку ачкоў, бітак і пад.”. У выніку пераасэнсавання слова набыло новую семантыку, з якой ужо нярэдка ўжываецца ў публіцыстычных тэкстах: *Лясны турызм – новая “**фішка**” турыстычнай Беларусі* (“Звязда”,14.10.10.); *У Львове за апошнія гады з’явілася даволі шмат тэматычных і прымальных па кошце рэстаранчыкаў і кавярняў. Фірмовыя “**фішкі**” самых папулярных зведала на сабе карэспандэнт “Звязды”* (“Звязда”, 12.03.11.); *Упершыню будзе зладжана спаборніцтва конных рыцараў… Гэтая “**фішка**” дазволіць прывабіць да рыцарскага фэсту большую колькасць наведвальнікаў* (“Культура”, 19-25.03.11); *Не буду пераказваць журналісцкія **фішкі**, якімі дзяліліся польскія калегі* (“Звязда”, 26.10.10.). Тут рэалізуецца значэнне “самае моднае, цікавае, істотнае”. Менавіта з такой дэфініцыяй і пазнакай *жарг.* гэты назоўнік падаецца ў “Слоўніку новых слоў беларускай мовы” В.Уласевіч і Н.Даўгулевіч “(2009). У гэтым жа слоўніку зафіксаваны таксама і назоўнік *кайф* (*разм.* Прыемнае баўленне часу, атрыманне задавальнення ад чаго-небудзь; *жарг.* Атрыманне задавальнення ад выкарыстання наркотыкаў ці алкагольных напояў”). Неабходна заўважыць, што ў некаторых выпадках стылістычна маркіраваныя словы ў публіцыстычным радку бяруцца ў двукоссе, тым самым адлюстроўваючы пакуль іх нязвыкласць, метафарычнасць, іранічнае адценне, навізну. Разам з тым асобныя лексемы ўжываюцца без згаданага знака (*кайф, бабло, барыга*), што сведчыць пра іх фактычную асіміляцыю ў публіцыстычным стылі. Прынамсі з пункту гледжання аўтараў. Можна меркаваць, што падобная тэндэнцыя будзе працягвацца і паступова асобныя словы будуць пераходзіць з пасіўнага ў актыўны разрад. Сталі ж ужо звыклымі ў нашай мове лексемы *аблом, баксы, бомж* і г.д. Добра гэта ці не – іншая справа. Як вядома, “жарганізмы і мацерныя словы не характэрны для беларускага маўлення, бо яны амаль цалкам запазычаны з рускай мовы. Часта іх выкарыстанне звязана з надзвычай нізкай агульнай культурай і адсутнасцю культуры маўлення ў носьбітаў мовы”[4, 140]. На наш погляд, існуе пэўная небяспека, што з цягам часу ў выніку рэгулярнага выкарыстання ў друку асобных прастамоўных ці жаргонных лексічных адзінак яны могуць перастаць успрымацца рэцыпіентамі як нелітаратурныя і перайсці ў катэгорыю агульнаўжывальных. Тут варта нагадаць, што першапачаткова французскае слова *жаргон* (*jargon*) абазначала якраз “сапсаваную мову”. Расійскі лінгвіст А.Сяляеў сцвярджае, што рэгулярнасць выкарыстання падобнага кшталту слоў у СМІ рана ці позна выклікае змяненне іх сацыяльнай ацэнкі. Яны паступова пачынаюць пераходзіць у разрад нарматыўных сродкаў, што недапушчальна. На нашу думку, гэта непазбежна прывядзе да сур’ёзных парушэнняў чысціні маўлення, да фактычнага

разбурэння некаторых істотных пазіцый культуры беларускай мовы.

1. Лепешаў, І.Я. Асновы культуры мовы і стылістыкі. Практыкум / І.Я. Лепешаў. – Мн., 1989
2. Тамашэвіч, Т.Асновы культуры мовы: Тэксты лекцый / Т. Тамашэвіч.– Гродна.– 1985. – Частка 1.
3. Костомаров, В.Г. Русский язык на газетной полосе / В.Г. Костомаров // Психолингвистические проблемы массовой коммуникации: Сборник научных трудов. – М., 1974.
4. Антанюк, Л.А., Плотнікаў, Б.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампедыум / Л.А. Антанюк, Б.А. Плотнікаў. – Мн., 2003

НАЗВАНИЯ ПРАВОСЛАВНЫХ ХРАМОВ ВИТЕБЩИНЫ И СМОЛЕНЩИНЫ, МОТИВИРОВАННЫЕ АГИОНИМАМИ

О.А. Борисевич
Витебск, УО «ВГУ им. П.М. Машерова»

Вопрос о семантике собственных имён является одним из самых спорных вопросов при анализе онимической лексики. До сих пор нет чёткого определения данного термина.

Говоря о семантике собственного имени в целом, нам близка точка зрения А.М. Мезенко, высказанная ею в работе «Урбанонимия Белоруссии», согласно которой «все собственные имена имеют значение, различающееся в языке и речи и состоящее, кроме грамматического значения, из номинативного (или денотативного), понятийного (сигнификативного) и структурного компонентов, в каждом из которых проявляется специфика собственного имени» [1].

Материал и методы. Отсюда мы видим целесообразным обратить внимание на исследование принципов номинации как основу семантической классификации экклезионимного пространства, самым главным из которых является принцип номинации культового сооружения по его связи с человеком.

В первую очередь данную группу формируют онимы, мотивированные именами святых.

Принятие христианства Древней Русью и её крещение способствовало как укреплению международных связей с Византией, так и внедрению новых христианских имён, закреплённых в названиях культовых сооружений. Канонизированные имена записывались в «Святцах», церковных календарях, месяцесловах и давались новорождённым. Как правило, это были имена святых, которые особо почитались. И не случайно. Лучшие по народному значению и с точки зрения благозвучности иноземные имена, вошедшие позже в церковные календари, были некогда собраны греками византийской эпохи у народов, с которыми они поддерживали торговые и культурные отношения.

В экклезионимной системе имя святого выступает как денотат. Рассмотрим основные имена, используемые в наименованиях храмов изучаемого нами региона.

Названия в честь святых составляют почти треть от всех наименований культовых сооружений в каждой из епархий. Все экклезионимы данной группы можно разделить на две подгруппы в зависимости от того, женское или мужское имя входит в проприальную часть.

Святых женщин было намного меньше мужчин, поэтому и количество храмов в их честь значительно уступает во всех епархиях. В названиях культовых со-